2. *Яновский, И.* Скетчноутинг: визуальное мышление есть у каждого [Электронный ресурс] / И. Яновский. – Режим доступа: http://zillion.net/ru/blog/561/skietchnoutingh-vizual-noie-myshlieniie-iest-u-kazhdogho. – Дата доступа: 20.11.2017.

***В. М. Бігеза,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай*
*дзейнасці Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта шматмерная і варыятыўная сістэма адносін чалавека да сусвету людзей і чалавечых адносін, сусвету культуры і прыроды. Як асобая выхаваўчая сістэма сацыяльна-культурная дзейнасць асаблівае значэнне набывае ў арганізацыі работы з дзецьмі.

На наш погляд, правамерна сцвярджэнне, што, пры разглядáнні змястоўнага аспекту названай сістэмы, неабходна звярнуць увагу на філасофска-сацыяльную сутнасць і грамадскае прызначэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці, якая з аднаго боку выконвае сацыялізіруючую функцыю, адлюстроўваючы погляды і перакананні пэўнага чалавека (групы людзей), а таксама з улікам узроставых асаблівасцей развівае працэсы выхавання і інкультурацыі розных суб’ектаў у грамадстве, з другога – сацыяльна-культурная дзейнасць, па сцвярджэнні навукоўцаў, прызначана падтрымліваць спрыяльны клімат у соцыуме, клапаціцца аб духоўна-маральным здароў’і індывідуумаў, фарміраваць іх каштоўнасныя арыентацыі [5, с. 36–37].

Сёння ў якасці асноўнага прадукту сацыякультурнага прагрэса выступае развіццё асобы, фарміраванне яе каштоўнасных арыентацый. Значная роля ў гэтым працэсе належыць бібліятэцы, якую лічаць сацыякультурным інстытутам грамадства.

Вядомы культуролаг М. А. Арыярскі падкрэсліваў ролю бібліятэкі ў рэалізацыі пазашкольных формаў сацыялізацыі,

інкультурацыі і індывідуалізацыі асобы; садзейнічанні сям'і і школе ў маральна-эстэтычным выхаванні дзяцей і моладзі; арганізацыі інтэлектуальна насычанага вольнага часу розных груп насельніцтва [1, с. 333].

Бібліятэка належыць да ўстаноў, якія прапануюць сваім карыстальнікам пэўную сістэму каштоўнасных арыентацый, што дазваляе актыўна ўздзейнічаць на фарміраванне асобы падлетка.

Каштоўнасныя арыентацыі – найважнейшы кампанент усведамлення асобы, які істотна ўдзейнічае на ўспрыманне наваколля, адносіны да грамадства і ўяўленні чалавека аб самім сабе. Вывучэннем каштоўнасных арыентацый займаліся Б. Г. Ананьеў, Л. І. Бажовіч, Л. П. Буява, Л. Б. Коган, І. С. Кон, М. Д. Нікандрава і інш. Каштоўнасныя арыентацыі трактуюцца псіхолагамі як адлюстраванне ў усведамленні чалавека каштоўнасцей, якія прызнаюцца ім у якасці стратэгічных жыццёвых мэт і агульных светапоглядных арыенціраў. Д. А. Лявонцьеў лічыць, што «Каштоўнасныя арыентацыі асобы фарміруюцца ў працэсе сацыялізацыі праз засваенне каштоўнасцей грамадства, рэферэнтных сацыяльных груп і агульначалавечых каштоўнасцей… утвараюць устойлівую іерархію, арганізаваную сістэму, змены ў якой звязаны са зменамі асобы ў цэлым» [3].

Неабходна падкрэсліць, што каштоўнасці нельга навязаць, яны могуць быць прывітыя толькі ў выніку свабоднага асабістага асэнсаванага выбару. Успрыняцце розных каштоўнасцей у значнай ступені звязана з уздзеяннем на эмацыянальную сферу чалавека.

Эмоцыі – паказчык стану дзіцяці, яны ўздзейнічаюць на яго псіхічныя, пазнавальныя працэсы і паводзіны, вызначаюць асаблівасці ўспрыняцця навакольнага свету, логіку меркаванняў. Як вядома, важная асаблівасць псіхікі дзяцей, характэрная для іх актыўнасці ў пазашкольных установах, – імкненне ўспрымаць свет індывідуальна і непасрэдна, параўноўваць веды, атрыманыя ў адукацыйнай установе з асабістымі ўражаннямі і цікавай для дзіцяці інфармацыяй.

Падлеткавы ўзрост з'яўляецца перыядам найбольш інтэнсіўнага асобаснага развіцця, калі афармляюцца каштоўнасныя арыентацыі, сацыяльныя ўстаноўкі, інтарэсы і захапленні, самаацэнка, якія ўздзейнічаюць на паводзіны, характар, культуру

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобы. Найбольш эфектыўна фарміруюцца каштоўнасныя арыентацыі ў падлеткаў, далучаных да працэсу дзейнасці вольнага часу, якая садзейнічае праяўленню творчага патэнцыялу асобы, самаразвіццю, узбагачэнню агульначалавечымі і культурнымі каштоўнасцямі. Вядомы навуковец Н. Ф. Максюцін сцвярджае, што «вольны час з’яўляецца спецыялізаванай падсістэмай духоўна-культурнага жыцця грамадства, якая функцыянальна аб’ядноўвае сацыяльныя інстытуты, прызваныя забяспечыць распаўсюджванне духоўна-культурных каштоўнасцей, іх творчае засваенне людзьмі ў сферы вольнага часу ў мэтах фарміравання гарманічна развітай, творча актыўнай асобы» [4, с. 21].

Сярод фактараў, якія аказваюць значны ўплыў на ўзнікненне каштоўнасных арыентацый чалавека, неабходна назваць чытанне, якое з’яўляецца найвялікшым культурным феноменам. Вядомы навуковец В. А. Лявідаў падкрэсліваў, што бібліятэкі ўносяць вялікі ўклад у падтрымку статусу чытання, якасці чытання і ўспрыняцця літаратуры [2, с. 111]. Чытанне можа выкарыстоўвацца не толькі для развіцця інтэлектуальных здольнасцей, але і для фарміравання каштоўнасных арыентацый падлеткаў. Менавіта вольны час садзейнічае ў значнай ступені вырашэнню задачы далучэння дзяцей да чытання, калі праяўляецца майстэрства бібліятэкара захопліваць дзяцей кнігай, замацоўваць чытацкія навыкі, пашыраць дыяпазон чытацкай кампетэнтнасці. Гэтаму садзейнічаюць літаратурныя гульні, віктарыны, брэйн-рынгі, сеткавыя акцыі, паэтычныя рынгі, літаратурныя дыліжансы, кніжнае дэфіле, літаратурныя салоны, Дні новай кнігі, Дні літаратурных гульняў і іншыя мерапрыемствы і формы, якія дазваляюць прывабіць дзяцей і падлеткаў да актыўнай дзейнасці па развіцці іх чытацкай культуры, з’яўляюцца базісам для фарміравання іх каштоўнасных арыентацый, дзеці далучаюцца да працэсу творчага чытання, самастойнай творчасці, адчуваюць эстэтычную асалоду, узбагачаюцца ўспрыманнем цудоўнага, фарміруюць маральныя ідэалы.

Падкрэслім, што ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк шырока выкарыстоўваюцца інтэрактыўныя формы і метады, якія дапамагаюць сфарміраваць у дзяцей і падлеткаў пэўны багаж ведаў, абудзіць імкненне да самаадукацыі, рэалізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваіх здольнасцей, развіваць ініцыятыву, эмацыянальнае ўспрыманне, дазваляюць актыўна выкарыстоўваць творчы патэнцыял удзельнікаў мерапрыемстваў. Яны надаюць мерапрыемствам нефармальны характар і пашыраюць кругагляд.

У бібліятэках вялікай папулярнасцю карыстаюцца гульнявые інтэрактыўныя тэхналогіі (у мерапрыемства ўключаецца элемент гульні), якія садзейнічаюць вольнаму самавыяўленню дзіцяці. Насычанымі гульнявымі элементамі могуць быць літаратурныя віктарыны, падарожжы, конкурсы, аўкцыёны.

Адметнай тэндэнцыяй сацыякультурнай дзейнасці бібліятэкі з'яўляецца выкарыстанне дыялогавых формаў дыскусіі, агляды-дыялогі вечары-дыялогі і інш., якія эфектыўны ў зносінах падлеткаў з іншымі чытачамі падчас правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў. У ролі мадэратара бібліятэкар павінен мадэліраваць сітуацыі, якія садзейнічалі б свабоднаму абмену думкамі і выклікалі цікавасць да праблемы, якая абмяркоўваецца.

У бібліятэках шырокае распаўсюджанне атрымала акцыя як інтэрактыўная форма работы з чытачамі. Бібліятэчныя акцыі дазваляюць наладзіць узаемадзеянне з патэнцыяльнымі карыстальнікамі яшчэ да іх прыходу ў бібліятэку, рэкламіраваць і прасоўваць інавацыйныя інтэлектуальныя прадукты і паслугі бібліятэк (у тым ліку флэшмоб – загадзя спланаваная масавая акцыя з распрацаваным пэўным сцэнарыем).

Шырока выкарыстоўваюцца і інтэрактыўныя выставы, прызваныя арганізаваць жывыя зносіны паміж чытачамі, далучыць іх да абмеркавання пастаўленнай праблемы, а таксама забяспечыць зваротную сувязь паміж чытачамі і бібліятэкарамі. Адзначым таксама, што праз выставачную дзейнасць бібліятэкі рэалізуецца сацыяльная функцыя вольнага часу.

Сучасная камп'ютарызацыя бібліятэк дазволіла істотна пашырыць сацыякультурную дзейнасць бібліятэкі, падняць яе на новы ўзровень, што праяўляецца ў прымяненні новых формаў работы з дзецьмі і падлеткамі (відэагадзіны, медыякалейдаскопы, медыяпадарожжы і інш.).

Сацыяльныя сеткі маюць вялікія магчымасці для папулярызацыі кнігі і далучэння да чытання, пашыраецца кантактная аўдыторыя за кошт інтэрнет-карыстальнікаў, якія не наведваюць бібліятэку, але з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі сацыяльных сетак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнай віртуальнай пляцоўкай, якую можна выкарыстоўваць у шырокім дыяпазоне прадстаўлення шматграннай дзейнасці бібліятэкі, з'яўляецца сайт. З яго дапамогай у нашым выпадку можна інфармаваць чытачоў аб лепшых творах дзіцячай літаратуры, сацыякультурных мерапрыемствах (літаратурныя вечары і падарожжы, чытацкія канферэнцыі, правядзенні літаратурнай онлайн-гульні і г. д.), стварыўшы спецыяльную літаратурную старонку на сайце бібліятэкі.

Думаецца, што паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы дзіцячых бібліятэк Беларусі адкрые перад імі шырокія магчымасці стварэння і выкарыстання ў віртуальнай прасторы пляцовак для зносін з дзецьмі, падлеткамі, іх бацькамі. І гэта дасць свой плён у папулярызацыі лепшых дзіцячых кніг, фарміраванні чытацкай культуры, а праз яе – каштоўнасных арыентацый карыстальнікаў.

Сучасныя патрабаванні да выхавання падрастаючага пакалення абгрунтоўваюць неабходнасць удасканальвання работы дзіцячых бібліятэк па фарміраванні каштоўнасных арыентацый дзяцей і падлеткаў сродкамі глыбока змястоўнай сацыякультурнай дзейнасці. Менавіта ад узроўню адукацыі і выхавання падрастаючага пакалення залежыць будучае дзяржавы.

1. *Ариарский, М. А.* Прикладная культурология как область научного знания и социальной практики / М. А. Ариарский. – СПб. : Анатолия, 1999. – 530 с.

2. *Левидов, В. А.* Художественная классика как средство духовного возрождения / В. А. Левидов. – СПб. : Петрополис, 1996. – 184 с.

3. *Леонтьев, Д. А.* Ценностные ориентации / Д. А. Леонтьев // Человек : философско-энциклопедический словарь. – М., 2000. – С. 409–410.

4. *Максютин, Н. Ф.* Культурно-досуговая деятельность: конспект лекций, опорные занятия и определения : учеб. пособие / Н. Ф. Максютин. – Казань : Медицина, 1995. – 137 с.

5. *Переверзева, Ю. А.* Библиотека как современный социально-культурный центр: теоретические и организационные вопросы деятельности / Ю. А. Переверзева // Материалы Междунар. конгресса «Библиотека как феномен культуры» (Минск, 23–24 окт. 2013 г.) / НББ ; сост. А. А. Суша. – Минск, 2013. – С. 36–41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ